организатор получает неоспоримые преимущества перед талантливым музыкантом, который целиком занят совершенствованием своей профессии и считает, что самому «пиарить» свой проект по меньшей мере неэтично. В то же время подобная отстраненная позиция музыкантов часто диктуется элементарным неумением просто и доходчиво, не прячась за обилие специальных терминов, рассказать о своем проекте и тем самым сориентировать журналистов, на что им обратить особое внимание. Не имея основательного музыкального образования, последние порой оказываются в растерянности: что же им писать, кроме сухой констатации события? В недоумении часто остаются даже «пишущие музыканты»: раньше в такой ситуации вполне мог выручить дежурный набор соответствующих эпитетов, сегодня такой вариант «не проходит». Зато вырос спрос на достаточно сжатые, но по возможности выразительные высказывания «по делу». Зная об этом, музыканты должны идти навстречу журналистам, не упуская шанса использовать их для своей рекламы. К будущей публикации должен готовиться не только журналист, предварительно изучая проблематику, но и музыкант, продумывая основные позиции своей «презентации».

Не меньшая активность требуется от музыкантов и в случае интервью или пресс-конференции с ними. Нельзя полностью надеяться только на возможные вопросы журналистов, можно и нужно «программировать» их интерес к тем деталям, которые могли бы украсить публикацию, но не давать собственной оценки своей работы, что всегда воспринимается как «давление». Добавим, что «сценарий» в таких случаях всякий раз должен быть разным, хоть немного непредсказуемым, ведь журналисты, готовясь к встрече, просматривают прошлые публикации в том числе и для того, чтобы их материалы были оригинальными по сравнению с уже существующими.

Подобная новая система взаимоотношений музыкантов и СМИ позволит более объемно и полноценно освещать процессы, происходящие в национальной культуре.

Аксана Бязлепкіна
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт

СТРАТЭГІЯ І ТАКТЫКА Ў ЛІТАРАТУРНАЙ КРЫТЫЦЫ (на прыкладзе тэкстаў І.М. Запрудскага)

Крытычныя тэксты аўтара, які выступае ў друку рэгулярна і дастаткова доўга, даюць падставы меркаваць пра пэўныя творчыя стратэгію і тактыку. Пра іх (не)усвядомленасць меркаваць цяжка: з

аднаго боку, наяўнасць стратэгіі мае на ўвазе і наяўнасць мэты, што відавочна мусіць адзначацца рацыянальным падыходам, але з іншага – у гуманітарнай сферы некаторыя захады могуць мець адваротныя наступствы, да якіх аўтар не толькі не імкнуўся, але і не чакаў.

Адна з галоўных мэт крытычнай дзейнасці Ігара Запрудскага – зрабіць беларускую літаратуру больш чытэльнай, наблізіць да беларускага чытача (мэтавая аўдыторыя яго крытыкі – найчасцей самі ўдзельнікі літаратурнага працэсу, якія, прыслухаўшыся да меркавання крытыка, і павінны ажыццявіць гэтае набліжэнне): «Як прымусіць наш «білінгвістычны» народ чытаць айчынных класікаў? Адкажыце!» [1, с. 11]. Мэта выглядае досыць безабароннай, бо стратэгію па яе дасягненні амаль немагчыма канкрэтызаваць, у ёй занадта шмат напрамкаў, часам супрацьлеглых. Пры гэтым мэта трактуецца крытыкам досыць строга: ён мае ўяўны ідэал-эталон, якім «правярае» ўсе літаратурныя факты і тэксты, пры гэтым аднолькава адмоўна трактуецца і «недабор», і «перабор». Эвалюцыя поглядаў крытыка адбіваецца на «эталоне» і, безумоўна, на крытыцы, што можа выглядаць камічна.

Адпаведна тыя тактычныя крокі, што выкарыстоўваюцца Ігарам Запрудскім у яго крытычных артыкулах, маюць спрэчную аптымальнасць, але могуць выйграваць за кошт «унікальнасці» (яго творчая стратэгія адрозніваецца ад тых, што абіраюць іншыя сучасныя беларускія крытыкі).

1. Суб'ектыўная канцэптуалізацыя літаратурнага працэсу.

Для ажыццяўлення мэты (набліжэння літаратуры да чытача) спачатку трэба асэнсаваць, чым ёсць беларуская літаратура, якія працэсы ў ёй адбываюцца. Крытык апрацоўвае абмежаваную колькасць фактаў, генералізуе і робіць высновы, якія павінны працаваць для ўсёй літаратуры ці літаратурнага працэсу, на што патрабуюцца пэўныя здольнасці, інтуіцыя і смеласць, бо ёсць рызыка памыліцца з аналізам актуальнай ці мінулай сітуацыі або з прагнозамі.

У выніку атрымліваюцца тэзісы, якія немагчыма даказаць, але ў якія можна верыць. Напрыклад: «Па вялікім рахунку, беларускае прыгожае пісьменства і не магло не «плакаць», каб заставацца праўдзівым адбіткам галоўных тэндэнцый жыцця. І цяга да так званай ваеннай прозы, магчыма, не ў апошнюю чаргу звязана з гэтым, бо ў нядаўні час было дазволена выяўляць негатыўнае толькі ў паказе падзей, звязаных з вайной» [1, с. 113].

Наяўнасць суб'ектыўнага эталона накладае адбітак на многія ацэнкі крытыка: «Багемны інтэлект, багемнае мысленне, калектыўнае

па сутнасці, – гэта адзінае, чаго нам праз гады рэальна неставала ў літаратуры для паўнаты карціны, цэласнасці спектра, каб было як у людзей. Жартую, хачу, каб у нас было лепш. <…> Згадзіцеся, ніякія творчыя саюзы, ніякая індывідуальная зайздрасць да канкурэнта па пяру, які, як і ты, працуе ў адной з рэдакцый дзяржаўных калялітаратурных арганізацый, не заменяць духу, атмасферы нефармальнай разняволенай тусоўкі» [1, с. 157]. Ігнараванне тэрміналагічнага значэння слова «багема», пераканаўчае дамінаванне эмоцый над логікай становяцца хісткім фундаментам для далейшых разваг і высноў.

Такім чынам, падобнае канструяванне суб'ектыўнай карціны літаратурнага працэсу ёсць прыкметай беларускага аўтадыскурсу, у якім *суб'ектыўныя недахопы* трактуюцца як спецыфічныя каштоўнасці [гл. 2, с. 18] (вылучана мной. – *А. Б.*). Крытык дае суб'ектыўна вытлумачэнне працэсам, якія адбываюцца ў літаратуры, пры гэтым часта наяўнасць гэтых працэсаў сам і фармулюе.

2. Масавізацыя літаратурнага працэсу.

Імкненне крытыка наблізіць беларускую літаратуру да чытача магло б ацэньвацца выключна станоўча, калі б не збыткоўная экзальтацыя прапаноў і рашэнняў менавіта ў філалагічным кантэксце. Напрыклад, прапанова зрабіць з «Палескай хронікі» І. Мележа чытэльны «дайджэст» выглядае бяскрыўдна ў выкладчыцкіх кулуарах і па-блазенску (ці нават парушэннем карпаратыўнай этыкі) – у артыкуле прафесійнага філолага. Крытык гэта ўсведамляе і не баіцца рызыкаваць даверам чытача. Але гэта амбівалентная рыса.

Можна меркаваць, што на галоўную мэту крытыка працуюць прапанова пісаць успаміны пра сустрэчы з класікамі, перачытванне І. Запрудскім класікі, актуалізацыя персаналій пісьменнікаў, спробы пасучаснаму атэстоўваць даўнюю літаратуру.

3. Рэзкасць ацэнак.

Прыкладам бескампраміснасці меркаванняў і адточанасці ацэнак можна лічыць артыкул І. Запрудскага пра рускамоўную літаратуру Беларусі. Моўнае пытанне – адно з тых паліткарэктных, якое за вочы вырашаецца лаканічна, экспрэсіўна і катэгарычна, а ў публічнай прасторы вымагае ад удзельнікаў дыскусіі абмену рэверансамі пры нязменнасці пазіцыі. Ці ёсць часткай беларускай літаратуры рускамоўная літаратура Беларусі? Пытанне для рускамоўных аўтараў стратэгічнае, бо ад яго вырашэння залежыць прысутнасць іх твораў у школьнай і ўніверсітэцкай праграмах, увага крытыкаў і літаратуразнаўцаў, нарэшце грашовы поспех.

Пастуліраваная рускамоўнымі аўтарамі дыскрымінацыя выглядае нелагічна, калі ўлічыць, што большасць жыхароў Беларусі размаўляе і чытае акурат па-руску. І. Запрудскі разабраўся, у чым жа прычына таго, што творы рускамоўных літаратараў Беларусі а) мала чытаюць і б) мала даследуюць літаратуразнаўцы.

Сапраўды, пакуль што самі спробы прыцягнуць да сябе ўвагу ў рускамоўных пісьменнікаў гучнейшыя за іх творы. Чаму? І. Запрудскі тлумачыць сітуацыю з нечытаннем так: «“Няма “прапіскі” ў грамадскай свядомасці”, – цытую Андрэева. Дык няма не таму, што вы пішаце па-руску, а таму, **што** і **як** пішаце» [1, с. 77–78]. Наконт адсутнасці навуковай увагі крытык выказаўся наступным чынам: “Спецыялісты кафедры (рускай літаратуры філалагічнага факультэта БДУ, дзе даследуецца ўся рускамоўная літаратура. – *А.Б.*), як ніхто ў нас, уяўляюць **рэальную вагу і творчы патэнцыял рускай літаратуры Беларусі** на “кантыненце” ўсяго рускага прыгожага пісьменства. Ці не тут хаваецца прычына “крызісу”?» [1, с. 79].

І пытанне з плоскасці ідэалагічнай і фінансавай пераводзіцца ў бязлітасную эстэтычную прастору. Відавочна, што гэты тэкст – адказ на нападзенне, своеасаблівае абвяшчэнне вендэты, што не пакідае месца расслабленым разважанням, застаюцца толькі адточаныя аргументы, трапнае высмейванне.

Такім чынам, крытык на падставе абмежаванай колькасці фактаў стварае суб’ектыўную карціну літаратурнага працэсу, якая можа ў чымсьці адпавядаць ці не адпавядаць наяўнаму стану рэчаў. Пры гэтым маецца «эталон», праз суаднясенне з якім робяцца высновы пра факты літаратурнага працэсу. Пры рэпрэзентацыі класічных і / ці даўніх тэкстаў, а таксама асоб класікаў І. Запрудскі акрэслівае іх праз вобразы, зразумелыя масаваму чытачу. Кніга «Метафізіка беларускай літаратурнай крытыкі» атрымліваецца своеасаблівым чаргаваннем панарам літпрацэсу і папсовых характарыстык пісьменнікаў ці іх твораў: абгрунтаваны беларускі фундаменталізм Максіма Гарэцкага, беларускі Шцірліц Філон Кміта-Чарнабыльскі, ваенная проза Васіля Быкава як нацыянальная прага да негатыву, Фадзей (Тадэвуш) Булгарын як прататып здрадніка-патрыёта з паэмы Адама Міцкевіча «Конрад Валенрод», мясцовыя дартаньяны Генрыка Жавускага, Алесь Разанаў як перакладчык са стылю на стыль, гістарычная проза Валянціны Коўтун як спроба грамадскай рэфлексіі і ўратавання ўласнай душы аўтаркі, містычны рэалізм у прозе Раісы Баравіковай, абсурдызм твораў Андрэя Федарэнкі, умоўна дэтэктыўныя гісторыі Леаніда Маракова, натурфілалагічнае мысленне

Міколы Купрэева, магічны рэалізм тэкстаў Анатоля Казлова і Міхася Южыка, неасентыменталізм Віктара Праўдзіна, фетышызм, міфалагізм і схільнасць да інвентарызацыі крытыка Ірыны Шаўляковай. Стыль выказвання крытыка І. Запрудскага эмацыйны і катэгарычны (больш ярка і выйгрышна глядзіцца ў сітуацыі палемікі), прасякнуты аўтарскай логікай.

Літаратура

1. Запрудскі, І.М. Метафізіка беларускай літаратурнай крытыкі / І.М. Запрудскі. – Мінск: БДУ, 2013. – 219 с.
2. Колер, Г.-Б. Аспекты и стратегии институциональной и эстетической автономизации в «малых» литературах (на материале белорусской литературы первой трети XX в.) / Г.-Б. Колер, П. Науменко // Белорусская литература как модель развития «малых» (славянских) литератур: мат-лы к тематическому блоку на XV Международном съезде славистов (Минск, 20–27.08.2013). – Минск, 2013. – С. 7–90.

Арцём Кавалеўскі
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт

ІНФАРМАЦЫЙНАЯ НЯТОЕСНАСЦЬ ПАЭТЫЧНАГА ТЭКСТУ

Адна з асноўных мэт мастацкай камунікацыі (узаемаадносін чытача з тэкстам), як правіла, эстэтычная. Мастацкая мова не звязана непасрэдна з практычнай дзейнасцю чалавека і таму не мае прадпісальнага характару. Звычайная перадача інфармацыі ў працэсе мастацкай камунікацыі выступае хутчэй як сродак, чым як мэта, а таму і каштоўнасць мастацкага тэксту заключаецца ў тым, што ён заўсёды дае нам унікальную магчымасць самім даканструяваць аўтарскі тэкст у сваім фантазійным уяўленні. Паняцці «сэнс» і «інфармацыя», якую тэкст перадае, не з'яўляюцца тоеснымі, бо сэнс у твор прыўносіць аўтар, і сэнс, такім чынам, у творы адзіны, калі інфармацыя, якую тэкст перадае розным адрасатам, можа быць рознай. Пры гэтым, зразумела, паняцці сэнсу і інфармацыі ўзаемазвязаныя. Сама інфармацыя, якую нясе і перадае чытачу мастацкі тэкст, можа быць рознай. Згодна з канцэпцыяй школы І. Гальперына, інфармацыя ў тэксце падзяляецца на фактуальную, канцэптуальную і падтэкставую [гл. 1].

Паэтычны тэкст можа змяшчаць у сабе апісанне пэўных фактаў, месца і часу дзеяння, падвергнутых разважанням аўтара, рух сюжэтнай лініі (у паэзіі такімі характарыстыкамі адрозніваецца ў першую чаргу ліра-